# «ЧАС» У ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСАЎ

*Вецік Яніна Віктараўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Паняцце часу адноснае, ірэальнае і, у той жа час, рэальнае: яго нельга ўспрыняць органамі пачуццяў, але змены, выкліканыя часам, мы бачым ва ўсім. Час апрадмечваецца ў культуры беларусаў, бо час – гэта не тое, што ідзе, а тое, што адбываецца, што мае вымярэнне (адсюль праславянскае **vertę*), для чалавека ён мае форму лініі або кола, час мае мяжу (напрыклад, *вечар, дзень; зімовае і летняе сонцастаянне; дзявочы век, бабін век*). Час падзельны, таму ёсць тысячагоддзе, стагоддзе, год, месяц, тыдзень, дзень, гадзіна, мінута, секунда, хвіліна, момант, век. Паскорыць або запаволіць бег часу можна ў сне або казцы (нерэальным жыцці): *песні-замовы, песні пра ўдаву, абрад вырабу за кароткі час ручніка (“абыдзеннік”) для абароны вёскі ад хваробы*. Усе падзеі ў жыцці чалавека, жывёльнага і расліннага свету, прыроды размеркаваны па часе ад стварэння Сусвету, таму і склаліся прыкметы і павер’і нязменныя ў часе тысячагоддзямі: *На Прачыстую поле чыстае; Удзень мухі, увечары камары; У сакавік то сонца грэе, то снегам вее; Што да Пятра высахне пад кустом, тое пасля Іллі не высахне і на кусце; Калі восенню жабы пачынаюць глыбока пад ваду хавацца, то гэта прадказвае ранняе прыбліжэнне асенніх халадоў; Калі ў “куццёвую” ноч неба зорнае – будзе багаты прыплод жывёлы, добры ўраджай гароху; Калі быў пачатак, то будзе і канец.*

Калі ж адбываецца “збой” у часе, то гэта выклікае ў сваю чаргу неверагодныя падзеі, ці цуды. Звычайна гэта адбываецца на Купалле, Каляды, Вялікдзень, Вадохрышчы: *“іграе” сонца, цвіце папараць-кветка, зямля ракрывае скарбы, уся вада лекавая, можна ўбачыць суджанага* і інш.

Час адухаўляецца, таму ён бяжыць, ідзе, ляціць. Як і чалавек, час можа быць *адказны, апантаны, жаданы, глухі, вясёлы, злосны, напружаны, радасны, рашучы, суровы, шчаслівы, юнацкі, тужлівы.* Ён можы быць добрым і ліхім (злым), таму *У добрую часіну сказаты, а ў лыхую помовчаты; У такі час толькі ваўкам жаніцца; Часам і сцены маюць вушы.* У традыцыйнай культуры беларусаў існуе шмат забаронаў на

розныя віды работы ў пэўны час: *на Узвіжанне нельга хадзіць у лес, на Галавасека рэзаць круглае, выконваць розныя віды работы асабліва ў "вялікія" святы* і інш.

Прадказаць свой будучы час (даведацца пра свайго суджанага, сямейны лёс) можна, аднак таксама толькі ў пэўны час, перыяд: варажылі звычайна на Калядзы і Купалле (дні зімовага і летняга сонцастаяння, поўнач): *Дай Божа знаць, з кім век векаваць*.

Уздзейнічаць незвычайнаю, таямнічаю сілаю слова – шаптаць, замаўляць, нагаворваць, прысушваць, адсушваць – можна таксама ў пэўны час, звычайна да заходу сонца.

Час можна вымераць, таму існуе гадзіннік. Гадзіннік часта выступае аб'ектам сну: У соннік час уваходзіць сімвалам зменаў. Самы распаўсюджаны сон – гэта цыферблат буйным планам. Падсвядомасць нам кажа, што наша асоба з'яўляецца важнай у пэўных падзеях.

Беларус заўсёды спадзяецца на лепшае: *час лечыць, будзе час – будзе і квас*.